УДК 929:001.32[1+008](476)"1931/2020"Дарашэвіч Э.К.

# Requiescat in pace



На 89-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі навуковец, філосаф, культуролаг, педагог Энгельс Канстанцінавіч Дарашэвіч.

Энгельса Дарашэвіча, доктара філасофскіх навук, аднаго з заснавальнікаў беларускай культуралогіі, сацыёлага культуры, гісторыка навукі, педагога і даследчыка фальклору Беларусі ведаюць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, дзе ён працаваў да свайго апошняга дня, у шматлікіх навукова-даследчых і вышэйшых адукацыйных установах Беларусі і замежжа. Для яго сяброў, калег і вучняў Энгельс Дарашэвіч – прыклад самаадданасці адвечным каштоўнасцям навукі, духоўнасці і справядлівасці.

Энгельс Дарашэвіч нарадзіўся 26 кастрычніка 1931 г. у Мінску ў сям'і служачых. У Другую сусветную вайну сям'я была ў эвакуацыі, у тым ліку ў Сталінградзе, дзе яго маці Рэвека працавала ваенным медыкам. Бацька – Канстанцін Дарашэвіч – загінуў, змагаючыся з акупантамі ў мінскім падполлі. Першай навучальнай установай была 42-я мінская школа (якая дала свету нобелеўскага лаўрэата Жарэса Алфёрава). Пасля сканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 1953 г. выкладаў у Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1958 г. працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук БССР. У тым жа годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Георгій Валянцінавіч Пляханаў пра французскі матэрыялізм XVIII ст.», а ў 1985 г. – доктарскую «Філасофія эпохі Асветы ў Беларусі». У 1984 г. стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР за ўдзел у напісанні цыкла даследаванняў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 1990 г. Энгельсу Дарашэвічу ў Беларускім універсітэце культуры было прысвоена вучонае званне прафесара, а рэктар універсітэта Ядвіга Грыгаровіч, якая вельмі паважала Дарашэвіча за выданні па гісторыі педагогікі і веды па культуралогіі (даволі маладой у той час навукі), настойліва запрашала яго ва ўніверсітэт на асноўнае месца працы.

У 1990–2000-я гг. прафесар Э. К. Дарашэвіч працаваў у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (загадчыкам аддзела сацыялагічных даследа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванняў ідэалагічных працэсаў Рэспубліканскага цэнтра сацыялагічных даследаванняў пры Інстытуце філасофіі і права, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута сацыялогіі АН БССР) і ў сталічных установах вышэйшай адукацыі. Палявыя сацыялагічныя даследаванні і акадэмічныя поспехі трывала вывелі яго ў шэраг навукоўцаў, якія вывучаюць культуру па артэфактах, паводзінных праявах і дакументальных сведчаннях, а не выключна па кнігах і другасных крыніцах. З 2009 г. ён працаваў прафесарам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, працягваючы падтрымліваць плённыя навуковыя сувязі з акадэмічнай навукай, калектывам Інстытута філасофіі НАН Беларусі, удзельнічаў у палявой экспедыцыйнай дзейнасці кафедры, кіраваў дыпломнымі даследаваннямі выпускнікоў.




Асноўныя манаграфіі, 1972–2016

Апошняя кніга майстра «Мае ўспаміны» пабачыць свет цягам бягучага года, яе вельмі чакаюць яго калегі і вучні, для якіх Энгельс Дарашэвіч – назаўжды застанецца прыкладам самаадданасці каштоўнасцям навукі, духоўнасці, справядлівасці і патрыятызму. Вечная памяць, спачывай з мірам, шаноўны спадар Энгельс!

*Вячаслаў Калацэй,*
*загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, дацэнт,*
*кандыдат культуралогіі, аспірант Энгельса Дарашэвіча ў 1996–1999 гг.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ